Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 СНЕЖНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 251 (30385)



ПЕРАДНАВАГОДНІ ГАНДАЛЬ: НА ЛЮБЫ ГУСТ І КАШАЛЁК 6



## Пад знакам інтэграцыі

*У насычаным графіку Прэзідэнта Беларусі — чарговая камандзіроўка. Гэтым разам — рабочы візіт у Санкт-Пецярбург, дзе ўчора прайшоў нефармальны саміт лідараў краін СНД, падчас якога падвялі вынікі года і абмеркавалі перспектывы. На сёння запланавана пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета.*

(Падрабязнасці на стар. 2-3)



## «ХОЧАШ ПАДНЯЦЦА ВЫШЭЙ — НЕ ЛАМАЙ ПАБУДАВАНУЮ ДА ЦЯБЕ ПАКАЛЕННЯМІ АПОРУ. АБАПІРАЙСЯ НА ЯЕ І ІДЗІ НАПЕРАД»

### Сур'ёзная размова ў святочных дэкарацыях — аб чым Прэзідэнт гаварыў з удзельнікамі навагодняга балю





Палац Незалежнасці прыняў баль. Традыцыйны навагодні баль для моладзі сабраў больш як 300 таленавітых, разумных, амбіцыйных і крэатыўных маладых людзей. Запрашальнымі білетамі для іх сталі поспехі ў навуцы, творчасці, спорце, актыўная грамадская дзейнасць. У зале ўрачыстых цырымоній сабраліся стыпендыяты фондаў Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі і сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, уладальнікі стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, лаўрэаты і пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. З цветам нацыі сустрэўся і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Па традыцыі кіраўнік дзяржавы кожны год адкрывае навагодні баль.

СТАР. 4







ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# ПАГЛЫБЛЕННЕ ПАРТНЁРСТВА Ў САМЫХ РОЗНЫХ ГАЛІНАХ

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА прыняў удзел у нефармальнай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД

**Нефармальныя сустрэчы кіраўнікоў краін — удзельніц СНД перад Новым годам у Санкт-Пецярбургу сталі ўжо добрай традыцыяй. На ёй лідары дзяржаў звяраюць гадзіннікі наконт таго, што было зроблена ў рамках работы ў Садружнасці і што трэба зрабіць у найбліжэйшы час.**



Сёлета пратакол сустрэчы быў парушаны надзвычайным здарэннем — авіякатастрофай самалёта азербайджанскай кампаніі, які накіроўваўся з Баку ў Грозны. Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў, чый удзел у саміце быў пацверджаны, быў ужо амаль на месцы, але вымушаны быў развярнуцца і вярнуцца ў Баку.

З гэтага паведамлення і пачаў сустрэчу Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, які адкрыў саміт. Яго краіна ў гэтым годзе завяршае сваё старшынства ў Садружнасці і перадае паўнамоцтвы Таджыкістану. Уладзімір Пуцін ад імя лідараў краін Садружнасці выказаў спачуванні сем'ям загінулых і ўсім пацярпелым у сувязі з крушэннем азербайджанскага самалёта ў Казахстане. «Упэўнены, будзе праведзена грунтоўнае расследаванне. Мы ўзгоднім работу нашых спецыяльных і авіяцыйных службаў па ўсіх пытаннях, звязаных з гэтай трагедыяй», — сказаў Прэзідэнт Расіі.

Гаворачы аб развіцці інтэграцыі на прасторы СНД, Уладзімір Пуцін звярнуў увагу, што тавараабарот Расіі з удзельнікамі СНД, паводле даных за студзень — кастрычнік, прыбавіў 10,6 працэнта і склаў крыху больш за $93 млрд. Паводле яго слоў, прыкметна палепшыліся і макраэканамічныя паказчыкі ў дзяржавах СНД. Так, па выніках 2024 года рост сукупнага ВУП у краінах Садружнасці прагназуецца на ўзроўні 4,7 працэнта. Гэта вышэй за агульнасусветны паказчык.

«Пашыраецца супрацоўніцтва краін СНД у валютна-фінансавай сферы. Для абслугоўвання ўзаемных эканамічных аперацый усё актыўней выкарыстоўваюцца ўласныя незалежныя плацежныя сістэмы і разліковыя інструменты. Доля нацыянальных валют у разліках па камерцыйных здзелках паміж удзельнікамі Садружнасці перасягае 85 працэнтаў», — расказаў расійскі Прэзідэнт.

**Падчас саміту Уладзімір Пуцін нагадаў, што ў наступным годзе будзе святкавацца знакавы юбілей — 80-я гадавіна Вялікай Перамогі. У сувязі з гэтым ён запрасіў сваіх калег на юбілейныя ўрачыстасці, якія пройдуць у Маскве 9 мая.**

«Перакананы, што паглыбленне партнёрства ў рамках Садружнасці ў самых розных галінах адпавядае карэнным інтарэсам народаў нашых краін. І ўпэўнены: мы будзем і далей разам працаваць над вырашэннем задач сацыяльна-эканамічнага развіцця, умацавання стабільнасці і бяспекі», — сказаў на заканчэнне расійскі лідар.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**
**Фота БелТА.**

### Лічбы сведчаць

**Доля нацыянальных валют у разліках па камерцыйных здзелках паміж удзельнікамі Садружнасці складае больш за 85 %.**

**Сёння адбудзецца пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Сустрэча кіраўнікоў дзяржаў пройдзе ў вузкім і пашыраным складзе.**

**У парадак дня пасяджэння ўключана каля двух дзясяткаў пытанняў. Лідары краін ЕАЭС абмяркуюць стратэгічныя напрамкі дзейнасці саюза, у тым ліку ход фарміравання агульных рынкаў энергарэсурсаў і далейшую гарманізацыю заканадаўства, перспектывы развіцця супрацоўніцтва з трэцімі краінамі, а таксама шэраг рабочых пытанняў.**

**Чакаецца, што падчас пасяджэння Прэзідэнт агучыць мэты і прыярытэты беларускага старшынства ў органах ЕАЭС у 2025 годзе.**



## Лічбы сведчаць

По выніках 2024 года рост сукупнага ВУП у краінах Садружнасці прагназуецца на ўзроўні **4,7 %**. Гэта вышэй за агульнасусветны паказчык.

## ДАРЭЧЫ

Звычайна падобныя сустрэчы праходзяць у адным з палацаў расійскай паўночнай сталіцы. Гэтым разам нефармальную сустрэчу кіраўнікоў дзяржаў — членаў СНД вырашылі правесці не ў самім Санкт-Пецярбургу, а ў яго наваколлі. Пляцоўкай саміту быў выбраны Лядовы палац на тэрыторыі ўсесезоннага курорта «Ігора», што размясціўся на тэрыторыі Карэльскага перашыйка, да якога ад горада гадзіна язды.

На курорце «Ігора» самы высокі перапад вышынь і працяглая траса ў Ленінградскай вобласці. Зімой тут працуюць 10 гарналыжных схілаў з трасамі для рознага ўзроўню падрыхтоўкі.

У крокавай даступнасці ад курорта знаходзіцца самы сучасны аўтадром Расіі «Ігора Драйв», дзе ўпершыню ў свеце на адной тэрыторыі функцыянуе дзесяць трас для розных відаў аўта- і мотаспорту.



## Лічбы сведчаць

Тавараабарот Расіі з удзельнікамі СНД, паводле даных за студзень — кастрычнік, прыбавіў **10,6 %** і склаў крыху больш за **93 млрд** долараў.

## Тым часам

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Азербайджана Ільхаму Аліеву ў сувязі з трагічнай гібеллю людзей у выніку крушэння пасажырскага самалёта авіякампаніі «AZAL» у раёне горада Актау ў Казахстане, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі гэта паведамленне ўспрынялі з пачуццём глыбокага болю і смутку.

«Беларусы падзяляюць цяжар бяды, што напаткала братэрскі народ Азербайджана, і гора незаменных страт», — гаворыцца ў спачуванні.

Аляксандр Лукашэнка таксама перадаў шчырыя словы падтрымкі і спачування ўсім родным і блізкім загінулых, пажадаў хутчэйшага аднаўлення пацярпелым.

Дабрачыннасць

# КАЛЯДНЫЯ ПАДАРУНКІ АД ПРЭЗІДЭНТА

**У святочныя дні кожны чакае цуду. Асабліва тыя, каго не надта песціць лёс, — дзеці-сіроты, адзінокія старыя, інваліды, якія засталіся без сямейнай падтрымкі. І цуд для іх здараецца — яны не адчуваюць сябе пакінутымі ў святочнай мітусні, ведаючы, што яны патрэбныя, што свята прыйшло і да іх. Такая вось простая філасофія, зразумелая кожнаму беларусу, кіруючыся якой у краіне ўжо каторы год праводзяцца дабрачынныя акцыі «Нашы дзеці» і «Ад усёй душы». Абедзве былі ініцыяваны кіраўніком дзяржавы, абедзве штогод праводзяцца пад непасрэдным патранатам Аляксандра Лукашэнкі і з яго ўдзелам. Сёлета, напрыклад, першыя падарункі ад Прэзідэнта атрымалі ў час святкавання каталіцкага Раства.**

## «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ШТО НАС НЕ ЗАБЫВАЮЦЬ»

Лагішынскі дом міласэрнасці ў Пінскім раёне лічыцца каталіцкай установай, пансіянат патрануе Рымска-каталіцкая царква, але прымаюць там людзей незалежна ад іх веравызнання і іншых аспектаў. Галоўная мэта — сацыяльная дапамога адзінокім, хворым, састарэлым людзям. Цяпер у пансіянаце пражываюць 43 пастаяльцы, і кожнаму патрэбны клопат і ўвага. Напярэдадні святога вечара пастаяльцам да святочнага стала перадалі падарункі ад кіраўніка дзяржавы: сыры, мясныя вырабы, мёд, прысмакі. У тым ліку бульбу і яблыкі, вырашчаныя ў гаспадарцы Прэзідэнта.

«У мяне сёння кранальная і хвалюючая місія — выканаць даручэнне Прэзідэнта і перадаць дары з яго агарода нашым заслужаным людзям, якія свае жыццё прысвяцілі працы і будаўніцтву грамадства, у якім мы цяпер жывём», — сказаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК.** Ён цёпла і сардэчна павіншаваў састарэлых людзей з зімовымі святамі.

Сяргей Вярышка — самы малады пастаялец гэтага пансіяната, у студзені адсвяткуе 60-годдзе. Ён каталік, і напярэдадні Раства яму было вельмі прыемна атрымаць падарунак ад кіраўніка дзяржавы.

«Але нават не ў падарунку справа. Самае галоўнае — што нас не забываюць. Дай Бог, каб святы праходзілі ў ціхай абстаноўцы, не так, як ва Украіне. Няхай у нас такога не будзе», — для Сяргея, як ён прызнаецца, гэта самае запаветнае жаданне.

> **«Але нават не ў падарунку справа. Самае галоўнае — што нас не забываюць. Дай Бог, каб святы праходзілі ў ціхай абстаноўцы, не так, як ва Украіне. Няхай у нас такога не будзе», — для Сяргея, як ён прызнаецца, гэта самае запаветнае жаданне.**

Для 65-гадовага Чэслава Семаковіча Каляды — асаблівае свята. Лёс яго не песціў: ён падарваўся на міне, таму самастойна абыходзіцца не можа. Ужо дзясяты год жыве ў Лагішынскім доме міласэрнасці. Мужчына не страціў веру ў Бога і людзей, радуецца віншаванням і падарункам. А тут — падарунак ад кіраўніка дзяржавы. «Дзякуй вялікі, — кажа Чэслаў. — Такая ўвага прыемна, мы задаволеныя».


Фота БелТА.

## З ДАБРОМ І ЦЕПЛЫНЁЙ

А ў каталіцкі дзіцячы дабрачынны сацыяльна-рэабілітацыйны цэнтр Святога Лукі з падарункамі ад кіраўніка дзяржавы прыехаў **арцыбіскуп-мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Іосіф СТАНЕЎСКІ.**

Дзіцячы дабрачынны сацыяльна-рэабілітацыйны цэнтр Святога Лукі быў адкрыты ў вёсцы Лескаўка Бараўлянскага сельсавета 20 гадоў таму. Увесь гэты час ён прымае на размяшчэнне маленькіх пацыентаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, якія знаходзяцца на амбулаторным лячэнні. Адначасова ў двух будынках цэнтра, дзе створаны добрыя бытавыя ўмовы, могуць пражываць каля 20 дзяцей з дарослымі, якія іх суправаджаюць. У дзяцей складаныя дыягназы, хтосьці змагаецца з анкалагічным захворваннем працяглы час, і кожны пазітыўны момант у няпростых буднях для гэтых пацыентаў анкацэнтра вельмі важны. Вядома, маленькія пастаяльцы, якія мужна пераадольваюць цяжкасці, што выпалі на іх лёс, у гэтыя святочныя дні не маглі застацца без падарункаў — кожнаму з іх уручылі важкі пакет з прысмакамі і цацкамі.



Фота БелТА.

«Мы сустракаем вялікае свята Раства Хрыстова. Але яно — не толькі казка для людзей, мы ведаем, што Ісус Хрыстос, прыйшоўшы ў гэты свет, зведаў холад, голад і зло. Але ён таксама вучыў людзей усё гэта пераадольваць. У такія дні хрысціяне таксама імкнуцца быць бліжэй да людзей, бо Хрыстос нараджаецца там, дзе дабро, дзе дапамога і падтрымка. Сёння ў каталіцкім цэнтры Святога Лукі мы знаходзімся побач з дзецьмі, якія змагаюцца з хваробамі, з цяжкасцямі. І мне даручана высокая місія — перадаць ад кіраўніка дзяржавы падарункі для гэтых дзяцей. Сёння ў гэтым месцы дзякуючы дзяржаве адбываецца свята Нараджэння Хрыста. Гэта дабро, цеплыня, а таксама ўвага да тых, хто мае патрэбу ў асаблівым клопаце», — адзначыў Іосіф Станеўскі.

**Паводле БелТА.**

# «ХОЧАШ ПАДНЯЦЦА ВЫШЭЙ — НЕ ЛАМАЙ ПАБУДАВАНУЮ ДА ЦЯБЕ ПАКАЛЕННЯМІ АПОРУ. АБАПІРАЙСЯ НА ЯЕ І ІДЗІ НАПЕРАД»







*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт растлумачыў, чаму запрасіў маладых людзей гэтым вечарам у Палац Незалежнасці. «Я запрасіў вас сюды, каб вы яркімі фарбамі, паўтараю — яркімі фарбамі — намалявалі, напісалі яшчэ адну старонку свайго жыцця», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што фота з гэтага вечара ўдзельнікі балю будуць пераглядаць доўга і ўспамінаць, як святкавалі гэты дзень.

Аляксандр Лукашэнка згадаў і гісторыю балю. Першапачаткова на гэтай пляцоўцы прапаноўвалася праводзіць Венскі баль. «Я тады падумаў: а чаму нехта павінен сюды прыехаць і стварыць нам такое свята? Мы павінны зрабіць гэта самі. І мы зрабілі», — сказаў ён. Навагодні баль у Палацы Незалежнасці праходзіць з 2018 года. Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, гэта ўжо традыцыя, і гэта сімвалічна. «Запомніце, з гэтага складаецца гісторыя любой дзяржавы, суверэннай і незалежнай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, зрабіўшы акцэнт на тым, што знакавыя традыцыйныя мерапрыемствы шмат гавораць аб дзяржаве.

## «БЕЛАРУСЬ — КРАІНА МАГЧЫМАСЦЯЎ»

«Сёння ў наш Палац Незалежнасці прыйшло яркае, прыгожае свята. Натхняльнае свята. Свята, галоўным упрыгажэннем якога з'яўляецеся вы, дарагія ўдзельнікі Навагодняга балю», — сказаў Прэзідэнт. Ён параіў ім не хвалявацца, асабліва юнакам. «Я разумею, дзяўчаты хутка засвойваюць танцы, мужыкі — марудней. Але вы не хвалюйцеся. Галоўнае, што вы тут. Галоўнае, што вы не пабаяліся разам са сваімі спадарожніцамі стаць на гэты танцпол і сёння адзначаеце гэтае свята», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што для яго вельмі важна, каб маладыя людзі адчулі гэтае свята, прасякнуліся атмасферай палаца, сімвала нашай Незалежнасці, паглядзелі на Мінск з яго вокнаў і на сваім прыкладзе ўпэўніліся, што Беларусь — гэта краіна магчымасцяў. «Для мяне вельмі важна, каб вы, знаходзячыся тут сярод людзей розных пасад, статусаў і ўзростаў, адчулі сутнасць ладу жыцця нашага грамадства, дзе ўсе роўныя ў сваіх магчымасцях, дзе змена пакаленняў будуецца на павазе да гістарычных дасягненняў народа і абавязкова на пераемнасці. Менавіта з такой галоўнай, на мой погляд, ідэяй я і прыйшоў у вялікую палітыку: захаваць пераемнасць. Была ўнутраная ўпэўненасць у правільнасці гэтага курсу і быў запыт грамадства. Таму была падтрымка з боку народа, бо кожны разважны грамадзянін разумеў простую ісціну: нам, беларусам, як мінімум не трэба змагацца за права будаваць сваю дзяржаву. Але як толькі забудземся ці здрадзім тым, хто прайшоў гэты шлях, — прыйдзецца пачынаць спачатку. І, што самае страшнае, сёння вы гэта бачыце, магчыма, прыйдзецца пачынаць спачатку са зброяй у руках, не дай бог. Вось такая праўда жыцця і філасофія поспеху: хочаш падняцца яшчэ вышэй — не ламай пабудаваную да цябе пакаленнямі апору. Абапірайся на яе і ідзі наперад», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што такая сур'ёзная размова можа здацца недарэчнай у святочных дэкарацыях. «Але дэкарацыі часовыя і не такія важныя. А момант, у якім вы знаходзіцеся, мае фундаментальнае значэнне. Для кагосьці ён можа аказацца лёсавызначальным», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў навагодняга балю, Прэзідэнт адзначыў, што гэты вечар падорыць ім шмат магчымасцяў набыць новых сяброў, пагутарыць з тымі, чый жыццёвы вопыт ужо сёння можа стаць сур'ёзным арыенцірам на будучыню.

«Яшчэ раз хачу павіншаваць вас, вашых родных і блізкіх, усіх беларусаў з надыходзячым Новым годам, з надыходзячымі святамі! Будзьце заўсёды шчаслівыя і беражыце сваю краіну — нашу любімую Беларусь», — сказаў Прэзідэнт.

Па традыцыі разам з дэбютантамі балю вальс танцаваў і Прэзідэнт. У бальнай карце некалькі традыцыйных танцаў: паланэз, кракавяк, полька, кадрыля, бурэ. Упершыню ў гісторыі балю ў Палацы Незалежнасці танцавалі шапелуаз.

## «ХОЧАЦЦА ЎСМІХАЦЦА І ДЗЯЛІЦЦА ПРЫГАЖОСЦЮ»

Да гэтага вечара ўдзельнікі рыхтаваліся не адзін месяц. Заняткі ў сваіх ВНУ, шматлікія мерапрыемствы, канферэнцыі маладыя людзі спалучалі з рэпетыцыямі, дзяўчаты актыўна выбіралі сукенкі. Як адзначылі ўдзельнікі балю, клопатаў хапала. Але яны таго вартыя. Кацярына Перапончык, студэнтка Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, прызналася, што ад гэтага вечара чакала цуду. І так атрымалася. «Усё як у казцы. Нават не верыцца, што гэта адбываецца на самай справе», — сказала Кацярына.

Па словах Яны Кульбіцкай, студэнткі інстытута сучасных ведаў імя Шырокава, такія мерапрыемствы дазваляюць усім дзяўчатам адчуць сябе сапраўднымі прынцэсамі, тое, што неабходна адчуць хоць бы раз у жыцці.

Ганна Чыжанкова, студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, расказала, што падчас рэпетыцый не адчувала, наколькі гэта важная падзея. «А сёння прачнулася і зразумела, як выдатна, што такі вечар у жыцці будзе. Гэта мерапрыемства такога высокага ўзроўню, сюды запрошаны найлепшыя студэнты. І ад гэтага настрой яшчэ лепшы. Хочацца бясконца ўсміхацца і дзяліцца прыгажосцю», — сказала яна.

Дар'я Дашкевіч, студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, са сваім партнёрам Кірылам Сідарэнкам, курсантам Акадэміі МУС, пазнаёмілася падчас рэпетыцый танцаў. Але ўзаемаразуменне знайшлі хутка. Не абышлося і без смешных момантаў. На першых рэпетыцыях Кірыл замест па вальса дэманстраваў страявы крок — яго ён рэпеціраваў больш, а падрыхтоўка да балю стала першым танцавальным досведам. Аднак хутка засвоіў і танцавальныя рухі. «Не ўсё атрымлівалася з першага разу, але я вельмі задаволены, што паўдзельнічаў у такім мерапрыемстве, важным як для мяне асабіста, так і для краіны», — адзначыў Кірыл.

Юлія Гурыновіч, магістрант БДУ, прызналася, што трапіць на такі баль было яе дзіцячай марай. «Лічу, што гэта галоўная ўзнагарода за ўсе дасягненні за гады вучобы ва ўніверсітэце. Гэта радасна і ў той жа час вельмі хвалююча».

Для Станіслава Мазуркевіча, студэнта Інстытута медыцынскай службы БДМУ, баль стаў яшчэ адной нагодай адзець парадную ваенную форму. Ён расказаў, што для людзей ваенных падрыхтоўка параднай формы — вельмі важны этап падрыхтоўкі да свята: усё павінна быць бездакорна, тым больш на мерапрыемстве такога ўзроўню. «Хваляванне прысутнічала. Але яно нас мабілізуе, дапамагае звяртаць увагу на ўсе дэталі. Улічваючы, што мы стаялі насупраць кіраўніка дзяржавы, права на памылку ў нас не было», — адзначыў Станіслаў.

Студэнты БДАТУ Дзіяна Гарачка і Яўген Познік прызналіся, што падрыхтоўка да балю была складанай: класічныя танцы патрабуюць шмат намаганняў. Але гэтым і адметны навагодні баль, ён дазваляе пазнаёміцца з класічнымі танцамі, пашырыць кругагляд. Як адзначылі маладыя людзі, ім найбольш даспадобы прыйшоўся класічны вальс і новы шапелуаз. «Гэты вечар мы дакладна ніколі не забудзем», — маладыя людзі былі адзіныя ў сваіх уражаннях.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА**
**і Віктара ІВАНЧЫКАВА.**






***Вы будучыня нашай краіны. Як бы гэта банальна ні гучала, заўсёды было так: моладзь — будучыня нашай краіны. І вельмі важна тое, які ў вас настрой, што вы думаеце аб будучыні. Можа быць, нашы меркаванні не супадаюць. Тады давайце знойдзем пэўны кампраміс, як гэта павінна быць у разумных славян, беларусаў. Мы заўсёды былі людзьмі памяркоўнымі і кампраміснымі. Гэта вельмі важна.***

*Аляксандр Лукашэнка*
*на сустрэчы са студэнтамі*
*інжынерна-тэхнічнага профілю.*
*27 верасня 2024 года.*

## З такой моладдзю можна спакойна глядзець у будучыню

«Прэзідэнт часта кажа, што моладзь — гэта будучыня краіны. І з гэтым нельга не пагадзіцца», — адзначае **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля КАРЧЭЎСКАЯ**. Яркім прыкладам таго, што ў нашай краіне адораную моладзь бачаць і падтрымліваюць, яна назвала традыцыйны навагодні баль у Палацы Незалежнасці. «Мы паміж сабой называем гэты баль балем нашых спадзяванняў. Такога мерапрыемства для моладзі няма нідзе ў свеце. Сюды запрошаны найлепшыя маладыя людзі з розных сфер жыццядзейнасці нашай краіны. Сярод запрошаных артыстаў — юныя таленты, якія пачынаюць свой шлях. І гэта таксама нашы надзеі. Гэта не проста свята, гэта сведчанне таго, што ў Беларусі талентам гарыць зялёнае святло. І ўсё, што адбываецца на гэтым балі, я ўпэўнена, маладым людзям, якія толькі пачынаюць свой жыццёвы шлях, запомніцца назаўжды. Не сумняваюся, што для іх гэта стане добрай матывацыяй яшчэ больш працаваць, актыўна развівацца і ніколі не спыняцца на дасягнутым.

У нашай краіне для маладога пакалення беларусаў створаны ўсе ўмовы. І навагодні баль гэта таксама пацвярджае: кожны чалавек, які імкнецца, працуе, які неабыякавы, можа стаць галоўным удзельнікам мерапрыемства такога высокага ўзроўню. Кожны чалавек у нашай дзяржаве можа трапіць у Палац Незалежнасці, палітычнае сэрца краіны. Гэта сведчыць аб тым, што кожны чалавек у Беларусі каштоўны, калі ён не шкадуе сіл дзеля развіцця сваёй краіны. У нас цудоўная моладзь. Яна выдатная. І з такой моладдзю можна не проста спакойна глядзець у будучыню — можна радавацца за гэту будучыню».

**Падрыхтавала**
**Валерыя СЦЯЦКО.**



Пераемнасць

# БЕРАЖЛІВАЕ СТАЎЛЕННЕ ДА КРАІНЫ — ТОЕ, ШТО ЯДНАЕ ПАКАЛЕННІ

### Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і члены Прэзідыума Савета Рэспублікі сустрэліся з членамі савета старэйшын пры Савеце Рэспублікі

**Такія сустрэчы ўжо сталі для парламентарыяў добрай традыцыяй. Савет старэйшын, у які ўваходзяць члены Савета Рэспублікі папярэдніх скліканняў, быў створаны, каб паважаныя сенатары маглі падзяліцца сваім багатым практычным вопытам у галіне заканадаўчага забеспячэння, фарміравання і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця, выказаць сваю пазіцыю адносна актуальных пытанняў у жыцці краіны і грамадства.**



Фота БелТА.

Напярэдадні Новага года прынята падводзіць вынікі года ўжо мінулага. Наталля Качанава падзякавала старэйшынам за тое, што тыя дамоўленасці, якія абмяркоўваюцца на савеце, рэалізоўваюцца. Па словах спікера, 2024-ы быў для Савета Рэспублікі асаблівым: упершыню прайшлі выбары ў адзіны дзень галасавання, і гэта форма паказала сваю рэзультатыўнасць. Пачаў работу новы склад Савета Рэспублікі, у які ўвайшлі дастойныя людзі з добрым прафесійным вопытам і беражлівым стаўленнем да краіны.

«Гэта сапраўдныя патрыёты. І мы разам, у тым ліку і з дзяржаўнымі органамі, вырашаем вельмі важныя і патрэбныя задачы, якія перад намі ставіць Прэзідэнт і якія вызначаны Усебеларускім народным сходам», — адзначыла Наталля Качанава.

За 30-годдзе інстытута прэзідэнцтва наша краіна прайшла шмат этапаў станаўлення і развіцця. «Нам нічога з неба не падала, гэта вельмі цяжкая праца ўсіх пакаленняў, якія па крупінках закладвалі добрыя традыцыі Беларусі, а самае галоўнае — прымнажалі эканамічную моц і ўмацоўвалі палітычную ролю нашай краіны на міжнароднай арэне. З намі лічацца, нашага Прэзідэнта паважаюць. Нягледзячы на санкцыйны ціск, сёння мы не знаходзімся ні ў якой ізаляцыі. Нашы сенатары часта выязджаюць за рубеж для таго, каб даносіць праўду аб нашай краіне», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава дадала, што члены Савета Рэспублікі ў гэтым годзе ўдзельнічалі ў Саміце будучыні ў Нью-Ёрку, у пасяджэнні сесіі Асамблеі МПС у Жэневе, у назіранні за выбарамі ва Узбекістане, у Азербайджане, былі з афіцыйным візітам у Кітаі.

## «ТРЭБА БЫЦЬ ТАМ, ДЗЕ МЫ ЗАПАТРАБАВАНЫ»

Сенатары, якія ўваходзяць у савет старэйшын, бачаць рэальную карысць ад яго дзейнасці. Як заўважыў у размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы шостага склікання Сяргей РАХМАНАЎ**, «наша задача ў рамках савета старэйшын заключаецца ў тым, каб унесці дадатковы аналітычны складнік у прыняцце рашэнняў».

«У савеце старэйшын, куды ўваходзяць людзі рознага профілю, мы кантактуем з рознымі структурамі і прыўносім свае веды ў розныя праекты. У цэлым работа савета старэйшын носіць практычны характар. Мы не тэарэтызуем, а стараемся ўнесці свой уклад у развіццё краіны, у падтрымку той лініі, якая сёння праводзіцца ў Беларусі, — сказаў Сяргей Рахманаў. — Цяпер наша задача заключаецца ў кансалідацыі грамадства з улікам будучай перадвыбарнай кампаніі».

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах (першае і другое скліканні), намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах (трэцяе і чацвёртае скліканні) Надзея ЕРМАКОВА** адзначыла: «Для мяне асабіста тое, што мяне выбралі і дэлегатам, і ў Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу, накладвае вялікую адказнасць. Нягледзячы на ўзрост, трэба быць у грамадскай рабоце, дзе ты запатрабаваны».

«Лічу, што гэты год добра прайшоў у краіне. Ён, вядома, вельмі насычаны, у тым ліку ў міжнародным плане. У эканоміцы склаліся добрыя паказчыкі. Гэта радуе. Гэта значыць, што ўсе працуюць на сваіх месцах. Кожны на сваім месцы павінен рабіць тое, што ўмее і на што здольны», — дапоўніла Надзея Ермакова.

**Паводле БелТА.**

Грамадства

# НАВУЧЫЦЬ ПАТРЫЯТЫЗМУ

### У Магілёве адбылася сустрэча старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля ІСАЧАНКІ з педагагічным актывам вобласці

**Удзел у ім узялі начальнікі ўпраўленняў і аддзелаў па адукацыі гарадскіх і раённых выканкамаў, кіраўнікі ўстаноў адукацыі, педагагічныя работнікі. Вучэбны год працягваецца, але напрыканцы каляндарнага года прынята падводзіць прамежкавыя вынікі ў адукацыі.**

— Мы абмеркавалі, што зроблена з боку дзяржавы, што трэба зрабіць з боку педагагічных работнікаў, — адзначыў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка ў размове з журналістамі. — Галоўнае — даць навучэнцам не толькі якасную адукацыю, але і навучыць іх быць сапраўднымі грамадзянамі, патрыётамі сваёй краіны. Гэта можна зрабіць толькі тады, калі мы працуем як адно цэлае. Бацькі, школа, сябры, нашы ветэраны, спартыўныя секцыі, іншыя арганізацыі — усе разам мы павінны выхаваць чалавека, які будзе любіць сваіх бацькоў, Радзіму.

Наглядным прыкладам таго, як краіна клапоціцца пра маладых спецыялістаў, стала ўручэнне ім ключоў ад арэндных кватэр. Сярод шчаслівчыкаў — **настаўнік гісторыі сярэдняй школы № 32 Бабруйска Максім СВІРЫДЭНКА.**

— Не чакаў, што, адпрацаваўшы ўсяго пару месяцаў, я, малады спецыяліст, атрымаю ключы ад двухпакаёўкі, — прызнаўся ён. — Я вельмі шчаслівы!

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



### Аляксей БАГДАНАЎ — аб пераднавагоднім гандлі: «Паліцы ломяцца, велізарны асартымент тавараў»

# СВЯТА — У ХАТУ!

**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей Багданаў у эфіры тэлеканала «Беларусь-1» пракаментаваў асартымент тавараў у пераднавагоднія дні, а таксама патлумачыў, чаму стала даражэй ікра і ці хопіць усім мандарынаў. Падрабязней — у матэрыяле.**

— Пераднавагоднія і калядныя дні — гэта, напэўна, адны з самых ажыятажных момантаў у дзейнасці і гандлю, і вытворцаў. Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю арыентуе ўсіх загадзя праводзіць мерапрыемствы. Мы як дзяржорган ужо з лістапада пачалі падрыхтоўку да навагодніх мерапрыемстваў, правялі шэраг нарад з аблвыканкамамі, упраўленнямі гандлю, гандлем і вытворцамі, — адзначыў Аляксей Багданаў.

Паводле яго слоў, сёння, прыходзячы ў краму, пакупнікі могуць бачыць вынік гэтай працы.

— Паліцы ломяцца ад мноства прадстаўленай прадукцыі, велізарны асартымент як нашых тавараў, так і імпартных. Мы бачым, што добра праведзена падрыхтоўка, тавараў на паліцах дастаткова, — адзначыў міністр.

Ён нагадаў, што сёлета на айчынныя тавары дзейнічае дзесяціпрацэнтная зніжка:

— Гэтая ініцыятыва нарадзілася ва ўрадзе, яна была падтрымана і вытворцамі, і гандлем. Зніжку даюць абодва ўдзельнікі працэсу: 5 % — вытворца, 5 % — гандаль. Спецыяльна было распрацавана абазначэнне тавараў, якія ўдзельнічаюць у гэтай акцыі.

Профільны міністр патлумачыў, што акцыя будзе доўжыцца да канца студзеня:

— Усё больш і больш таваравытворцаў уключаюцца ў гэтую дзейнасць. На сённяшні дзень прадстаўлены шырокі асартымент і харчовых, і нехарчовых тавараў. Быў выпадак: у адной з сетак продажу электрабытавай тэхнікі здарыўся ажыятажны попыт, нават не паспявалі дагружаць прадукцыю са складоў нашага вытворцы. Але сітуацыю хутка выправілі, — падкрэсліў кіраўнік МАРГ.

Што датычыцца попыту на іншыя тавары, Аляксей Багданаў расказаў, на колькі падаражэла чырвоная ікра і чаму гэта адбылося. Адказваючы на пытанне аб прычынах росту цэн на ікру і чырвоную рыбу, ён канстатаваў:



— Цана на імпартныя тавары залежыць не ад таго, што мы ў сябе ў Беларусі рэгулюем ці не, гэта знешняя кан'юнктура рынку. На сённяшні дзень з-за таго, што ў Расійскай Федэрацыі зніжаны аб'ём улову ласосевых рыб, яны вырабілі менш і чырвонай ікры, і мяса ласося. Таму мы адзначаем, што на працягу гэтага года цэны на ікру выраслі статыстычна на 33 %, а на мяса ласося — прыкладна на 15 %. Гэта не магло не адбіцца на паліцах крам. Але ў цэлым усё роўна цана на ікру застаецца даступнай.

Між тым кіраўнік МАРГ таксама адзначыў, што да навагодніх продажаў гандаль рыхтуецца загадзя.

— З сярэдзіны кастрычніка ўжо паволі пачынаецца фарміраванне складоў, дадаткова завозяцца тавары. Імпартныя тавары заказваюцца з іншых краін, на нашы тавары размяшчаюцца дадатковыя заяўкі. Ды і сам вытворца спаць не павінен. Разумеючы, што будзе павышаны попыт, ён павінен вырабіць больш і прапанаваць гэты тавар, — лічыць міністр.

> — Гэтая ініцыятыва нарадзілася ва ўрадзе, яна была падтрымана і вытворцамі, і гандлем. Зніжку даюць абодва ўдзельнікі працэсу: 5 % — вытворца, 5 % — гандаль. Спецыяльна было распрацавана абазначэнне тавараў, якія ўдзельнічаюць у гэтай акцыі.

Не засталася без увагі і тэма наяўнасці мандарынаў у крамах. Як адзначыў Аляксей Багданаў, сёлета з Турцыі завезлі на тысячу тон менш мандарынаў і клеменцінаў.

— Але ў цэлым пастаўшчыкоў у нас дастаткова. Мы ўвозім гэты прадукт з 15 краін. На сённяшні дзень (за 10 месяцаў) мы завезлі на 7 % больш мандарынаў і клеменцінаў — гэта 16,5 тысячы тон. Што цікава, цана стала ніжэй на 14 %. Гэта значыць, у іншых краінах ураджай атрымаўся лепей, чым у Турцыі. Адпаведна, мы прывезлі гэты тавар трохі танней. Таму можна не перажываць: ужо чаго-чаго, а мандарынаў хопіць на паліцах усім, як і іншых тавараў, — упэўнены міністр.

Адказваючы на пытанне аб тым, якія тавары традыцыйна даражэюць да Новага года, кіраўнік МАРГ падкрэсліў:

— Кожны раз усё па-новаму. У залежнасці ад таго, як складуцца спажывецкі попыт і кан'юнктура рынку на знешнім контуры. Калі мы ўвялі цэнавае рэгуляванне, тавары сталі больш-менш стабільныя. Калі ўжо даражэюць, то прагназавана. А да гэтага традыцыйна заўсёды даражэлі алкагольныя напоі, шакалад, кандытарскія вырабы, таксама частка імпартных тавараў — бананы, вінаград, апельсіны. Што датычыцца нашых тавараў, то тут сітуацыя больш стабільная: няма ажыятажнага росту цаны, ён знаходзіцца ў рамках прагнозу — таго, што мы ўстанавілі ва ўрадзе.

Разам з тым не абміналі і тэму навагодніх карпаратываў. Як адзначыў Аляксей Багданаў, кожны хоча правесці навагоднія святы ў коле блізкіх, сяброў і сваіх калектываў, арганізоўваючы карпаратывы:

— Мы таксама праводзім у міністэрстве свае карпаратывы і з цяжкасцю знайшлі сабе свабоднае месца. Вядома, цяпер шматлікія кавярні і рэстараны распісаны для такіх мерапрыемстваў. І мы бачым па тых даных, якія да нас паступаюць, што ў грамадзян гэтая паслуга карыстаецца попытам, — падкрэсліў міністр.

Дарэчы, у МАРГ разлічылі прыкладны кошт карпаратыву для аднаго чалавека:

— У залежнасці ад фармату ён сёлета складае ад 100 да 300 рублёў. Гэта павінна забяспечыць выбар паслугі на любы густ спажыўца.

Аляксей Багданаў выказаў упэўненасць, што беларускае грамадскае харчаванне, увеўшы мноства навінак, парадуе грамадзян.

**Па матэрыялах sb.by**




Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронного аукциона – имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Брест, ул. Я. Купалы, 110/2:**

| *Наименование (назначение), инвентарный номер* | *Общая площадь* |
|---|---|
| **Гараж** (здание специализированное автомобильного транспорта), инв. номер по ЕГРНИ 100/С-46058 (по бух. учету 100050). **Обременение:** аренда | 605,2 кв. м |
| **Хозяйственно-бытовой блок** (здание административно-хозяйственное), инв. номер по ЕГРНИ 100/С-69143 (по бух. учету 100048) | 296,5 кв. м |
| **Тепловая сеть** (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. номер по ЕГРНИ 100/С-60856 (по бух. учету 100039) | протяженность – 164,8 м |
| **Линия наружного освещения** (сооружение специализированное энергетики), инв. номер по ЕГРНИ 100/С-60859 (по бух. учету 100037) | протяженность – 221,7 м |
| **Кабельная линия электропередач** (сооружение специализированное энергетики), инв. номер по ЕГРНИ 100/С-60857 (по бух. учету 100029) | протяженность – 272,9 м |
| **Водопроводная сеть** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер по ЕГРНИ 100/С-60860 (по бух. учету 100028) | протяженность – 38,9 м |
| **Канализационная сеть** (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. номер по ЕГРНИ 100/С-60858 (по бух. учету 100038) | протяженность – 81,8 м |
| **Водопроводная сеть** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер по ЕГРНИ 100/С-60855 (по бух. учету 100027) | протяженность – 33,0 м |

**В состав лота входит иное имущество.** Перечень размещен на сайте организатора аукциона www.cpo.by и на электронной площадке ИПМ-Торги www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Предоставлен на праве постоянного пользования, кадастровый номер 140100000001008797, общей площадью 0,2295 га, для обслуживания гаража и здания хозяйственно-бытового блока |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **539 946,38 белорусских рублей** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

| | |
|---|---|
| **Срок заключения договоров купли-продажи** | Не позднее **30 календарных** дней с момента объявления победителя электронного аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |
